№ 25 (378)
Ліпень 2011 года

# Краязнаўчая газета

www.bfk.by

## У нумары:

Асяродак культуры: *вынікі бібліятэчнага конкурсу* – стар. 2

Царкоўнае краязнаўства: *забыты мітрапаліт* – стар. 4

Лёс: *з роду неўтаймаваных* – стар. 7




## На тым тыдні...

**19 чэрвеня** ў вёсцы Загалле на Любаншчыне прайшло **Русалле**. Звычайна яго праводзілі там, дзе не было Купалля. Продкі лічылі, што пад час вяснова-летняга квітнення русалкі выходзяць з вады і гуляюць па сёлах, лугах і палях. У нашыя дні гэтае цікавае беларускае свята ўзнаўляюць літаральна па драбніцах. Традыцыйнаю стравай Русалля лічыцца яешня.

**21 чэрвеня** ў Белдзяржфілармоніі пры падтрымцы Польскага Інстытута ў Мінску прайшоў **канцэрт джазавай музыкі** ў выкананні Artur Dutkiewicz Trio (Польшча). Імпрэза прысвячалася творчасці нашага земляка Чэслава Немэна. Прагучалі джазавыя імправізацыі, заснаваныя на творах з рэпертуару Немэна – «Сон пра Варшаву», «Пад Папугаямі», «Успаміны», «Жалобная рапсодыя памяці Бэма», «Аднаго сэрца», «Ці яшчэ мяне памятаеш» і інш.

**25 і 26 чэрвеня** ў Камянцы (Брэсцкая вобласць) прайшло **свята сярэднявечнай культуры і традыцыяў «Камянецкая вежа – 2011»**. Удзел бралі рыцарскія клубы з усёй Беларусі, госці з Масквы (больш за 300 удзельнікаў). У першы дзень галоўным быў рыцарскі турнір, сярод цікавостак другога – конкурс строяў. Не абышлося і без парных ды групавых паядынкаў, былі выступленні ансамбляў старадаўняй музыкі. Кожны мог паспрабаваць сябе ў якасці лучніка.

У старажытным Івянцы на Валожыншчыне **25 і 26 чэрвеня** прайшоў **Другі цукеркавы фэст**. Ініцыятарам яго правя-дзення выступіла фальклярыст і этнограф Антаніна Хатэнка, яе падтрымалі мясцовыя ўлады, Івянецкі музей традыцыйнай культуры, кандытарская фабрыка «Ивкон». Імпрэза праходзіла на сядзібе Паўла Драгунцава, колішняга ўладальніка мястэчка. Можна было не толькі паласавацца слодыччу, але і паслухаць беларускую музыку, прыдбаць вырабы мясцовых керамістаў. Адметна, што свята было цалкам беларускамоўным, што зусім не выклікала пярэчанняў ды непаразуменняў ні ад беларусаў, ні ад гасцей з Расіі, якіх было нямала на фэсце.




# Вынікі конкурсу «Мастацтва кнігі»

***У Маскве 7–8 чэрвеня 2011 года адбыўся VIII Міжнародны конкурс «Мастацтва кнігі» дзяржаваў-удзельніцаў СНД.***

Як паведаміла Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, нашая краіна выступіла на конкурсе 33 кнігамі (15 – дзяржаўных выдавецтваў, 18 – выдавецтваў прыватных і грамадскіх арганізацыяў).

Сябры міжнароднага журы (11 чал.) з шасці краінаў СНД вызначылі лаўрэатаў і намінантаў конкурсу. Па выніках яго беларускія кнігавыдаўцы атрымалі 7 дыпломаў (непараўнальна больш за ўсіх астатніх). Толькі выдаўцы Расіі раўняюцца з Беларуссю па колькасці атрыманых дыпломаў.

**Вынік конкурсу па намінацыях:**

– *«Гран-пры»* – дыплом лаўрэата атрымаў альбом «Радзівілы. Альбом партрэтаў XVIII–XIX стагоддзяў» (выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі»);

– *«Садружнасць»* – дыпломам лаўрэата атрымала кніга А. Суворава «Брэсцкая крэпасць. Вайна і мір» (выдавецтва «Паліграфіка»);

– *«Кніга для дзяцей і юнацтва»* – дыплом лаўрэата атрымала кніга Н. Віташэвіч-Чэкліч «Маленький Ангел. Христианская азбука» (выдавецтва «Братство в честь Святого Архистратига Михаила»);

– *«Культура, навука, адукацыя»* – дыплом намінанта атрымаў 4-томнік «Архітэктура Беларусі. Нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце. IX–XX ст.» (выдавецтва «Выдавецкі дом «Беларуская навука»);

– *«Арт-кніга»* – дыплом намінанта атрымала кніга «Сучасны беларускі жывапіс. XXI стагоддзе» (выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі»);

– *«Надрукавана ў Садружнасці»* – дыплом намінанта атрымала кніга «IN NOMINE DOMINI. Во Имя Бога» (выдавецтва «Про Хрысто»);

– *«Спецыяльны дыплом журы»* нададзены кнізе «Дзікае паляванне караля Стаха» (на беларускай, рускай, украінскай і англійскай мовах), прысвечанай 80-годдзю класіка беларускай літаратуры У. Караткевіча (выдавецтва «Беларускі фонд культуры»).

Як бачым, спецыяльным дыпломам журы ўганараваная кніга выдавецтва «Беларускі фонд культуры» «Дзікае паляванне караля Стаха». Яна была вылучаная Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (разам з альбомам «Радзівілы») на намінацыю «Гран-пры» і атрымала высокую адзнаку журы.

З аднаго боку нам прыемна, што заснавальнік «Краязнаўчай газеты» – Беларускі фонд культуры заслужыў высокую ўзнагароду ў прэстыжным конкурсе «Мастацтва кнігі», з другога – шкадуем аб пройгрышы ў спаборніцтве з выдавецтвам «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі», якое, між іншым, мы віншуем з перамогаю.

***Наш карэспандэнт***

# Чароўная ноч класікі ў скансэне

***10 чэрвеня ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту ў межах музычнага праекта «Шэдэўры сусветнай класікі ў музеі пад адкрытым небам», арганізаваным Міністэрствам культуры, Мінгарвыканкамам і Мінаблвыканкамам, адбыўся грандыёзны начны канцэрт майстроў оперы і аперэты «Чароўная ноч класікі».***

Імпрэза была падрыхтаваная Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатрам. Мастацкі кіраўнік праекта – заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь, мастацкі кіраўнік тэатра Адам Мурзіч, рэжысёр – Анастасія Грыненка, вядучая – Наталля Кірсанава. Адметнасцю канцэрта было тое, што на адной сцэне з вядучымі беларускімі салістамі Нацыянальнага акадэмічнага вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь і Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра выступілі расійскія зоркі са знакамітага Марыінскага тэатра, што ў Санкт-Пецярбургу, а таксама заслужаная артыстка Расіі, лаўрэат міжнародных конкурсаў Ларыса Юдзіна і лаўрэат міжнародных конкурсаў Ілля Гоўзіч з Вялікага тэатра Расіі.

У праграму канцэрта ўвайшлі папулярныя арыі, музычныя ўрыўкі з опер і аперэт, асобныя вакальныя і інструментальныя творы ў выкананні салістаў і ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра. За дырыжорскім пультам акрамя галоўнага дырыжора Алега Лесуна працавалі ўсе дырыжоры тэатра – лаўрэат міжнароднага конкурсу Юрый Галяс, Марына Траццякова і Мікалай Макарэвіч. Вялікім сюрпрызам для аматараў класікі стаў удзел у канцэрце дырыжора з ЗША Філіпа Сіманса, які напярэдадні прыляцеў з Гавайскіх астравоў. Дарэчы, за яскравае выкананне полькі «Трык-Трак» І. Штрауса ён быў узнагароджаны сапраўднымі авацыямі.



*Дуэт А. Мароза і Н. Дзяменцьевай*



*Заключны акорд свята*

Першымі на сцэну выйшлі расійскія спевакі. Пасля ўступнага паланеза з оперы «Яўген Анегін» у выкананні аркестра пад кіраўніцтвам Алега Лесуна і арыі Роберта з оперы «Іяланта», якую праспяваў лаўрэат міжнародных конкурсаў Ілля Сільчукоў, у канцэртнай зале музея пад адкрытым небам загучаў чароўны голас аляб'еўскага салаўя ад Ларысы Юдзінай. Нават калі б гэта быў адзіны яе выступ, дзеля яго трэба было прыехаць на канцэрт за любыя грошы. Кажуць, што на папярэдняй рэпетыцыі «Салаўя» адбыўся сапраўдны цуд – на голас спявачкі адгукнуліся салаўі з навакольных пералескаў. Мяркую, гэта пакінула незабыўныя ўражанні не толькі ў слухачоў, але і ў самой спявачкі.

У суправаджэнні аркестра пад кіраўніцтвам Філіпа Сіманса Ларыса Юдзіна выканала таксама арыю царыцы Ночы з оперы В.А. Моцарта «Чароўная флейта» і «Казкі Венскага лесу» І. Штраўса (дырыжор – Алег Лясун). Дзве оперныя партыі бездакорна (для гэтых умоваў) праспяваў Ілля Гоўзіч: Кавbooдосі з «Тоскі» Дж. Пучыні і герцага – з «Рыгалетта» Дж. Вердзі. Дарэчы, трэба адзначыць, што нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы для класічнага выканання вакальных твораў (мікрафоны, адсутнасць акустыкі канцэртнай залы, «свежае паветра» і інш.) гук быў вельмі добры. Надвор'е падаравала вельмі цёплую, сапраўды чароўную ноч, скрозь рэдкія аблокі на сцэну зазіраў месяц – вельмі рамантычна.

Вакальную эстафету ад расійскіх гасцей пераняллі мінскія салісты Станіслаў Трыфанаў, Эдуард Мартынюк, Віктар Цыркуновіч, Ганна Бяляева, Сяргей Суцько, Алег Прохараў, Лідзія Кузьміцкая, Яўген Ермакоў, Леся Лют. Прагучалі папулярныя творы П. Чайкоўскага, Дж. Пучыні, І. Штраўса, І. Кальмана, Ф. Легара і інш. Трэба адзначыць, што нашыя салісты таксама выглядалі вельмі годна і таксама парадавалі аматараў вакалу. Дарэчы, вакальнае майстэрства Віктара Цыркуновіча на імпрэзе было адзначанае Упраўленнем культуры Мінгарвыканкама і Мінскай гарадской арганізацыяй Беларускага прафсаюза работнікаў культуры дыпломам лаўрэата конкурсу прафесійнага майстэрства «Лепшыя імёны-2011» з прысуджэннем звання «Лепшы акцёр года».

Вельмі цёпла былі прынятыя слухачамі дуэты з аперэтаў І. Кальмана ў выкананні Андрэя Мароза з Маргарытай Александровіч («Прынцэса цырка») і з Наталляй Дзяменцьевай («Сільва»). Завяршыўся канцэрт агульным выкананнем сцэны «Зоркі тэатра» з аперэты «Баядэра» і маляўнічым залатым вогненным фантанам.

Нягледзячы на розныя хваляванні ўсё атрымалася! На жаль, прыбыткі не пакрылі выдаткаў на арганізацыю канцэрта. Аднак пачатак пакладзены. Гэтым самым распачатая новая цікавая старонка асветніцкай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. У наступным годзе чакаецца падобны канцэрт, але ўжо з удзелам артыстаў балета. Адзінае пажаданне да арганізатараў: каб канцэрты пачыналіся на гадзіну раней, тады «бязколавым» аматарам класікі не давядзецца ў Мінск дабірацца пешшу, як сёлета.

**Зм. ВОЖЫК**

***Фота аўтара***

# Вынікі XIX Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»

Падведзеныя вынікі штогадовага рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» за 2010 год. У ім бралі ўдзел 39 публічных бібліятэк, што прадставілі 41 працу. Традыцыйна найбольш актыўны ўдзел у конкурсе ўзялі бібліятэкі Мінскай вобласці (15 працаў). З Магілёўскай вобласці было даслана 8 працаў, з Гродзенскай – 6, Брэсцкай – 5, Гомельскай – 4, Віцебскай – 2. Мінск быў прадстаўлены 1 працай з Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк.

Пад час пасяджэння журы конкурсу ўсе яго члены адзінадушна адзначылі высокі ўзровень прадстаўленых працаў. 31 мая міністр культуры Рэспублікі Беларусь П.П. Латушка падпісаў загад «Аб выніках XIX Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры», паводле якога пераможцамі сталі:

*** у намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую працу з падрастаючым пакаленнем»:**

***Першая прэмія***

Дзіцячая бібліятэка № 4 ДУ «Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска» (загадчыца Л.С. Бусел)

Семежаўская сельская бібліятэка сеткі публічных бібліятэк Капыльскага раёна (загадчыца Н.А. Пілат)

***Другая прэмія***

Рэчыцкая гарадская дзіцячая бібліятэка імя А.П. Гайдара *(загадчыца Г.У. Канцавая)*

Лапацiцкая сельская бібліятэка сеткі публічных бібліятэк Слаўгарадскага раёна *(загадчыца Н.А. Шамалава)*

***Трэцяя прэмія***

Дзіцячая бібліятэка № 6 імя М. Астроўскага УК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Бабруйска» *(загадчыца В.У. Хархалёва)*

Межанская сельская бібліятэка сеткі публічных бібліятэк Браслаўскага раёна (бібліятэкар Л.П. Бялюн)

*** у намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»:**

***Першая прэмія***

УК «Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна» *(дырэктар І.У. Сарокіна)*

***Другая прэмія***

Слуцкая гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 3 *(загадчыца Г.М. Шахновіч)*

***Трэцяя прэмія***

Лідская цэнтральная раённая бібліятэка імя Янкі Купалы *(дырэктар Г.А. Шабаліна)*

*** у намінацыі «За пошукавую і даследчую працу»:**

***Першая прэмія***

УК «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага» *(дырэктар Л.У. Мальцава)*

Гарадзецкая сельская бібліятэка сеткі публічных бібліятэк Шклоўскага раёна *(бібліятэкар В.В. Алейнікава)*

***Другая прэмія***

Баранавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка *(загадчыца аддзела абслугоўвання і інфармацыі І.П. Томарава)*

Рудня-Марымонаўская сельская бібліятэка сеткі публічных бібліятэк Гомельскага раёна *(бібліятэкар Т.П. Бандарэнка)*

***Трэцяя прэмія***

Ельская цэнтральная раённая бібліятэка *(дырэктар Н.А. Суткаленка)*

Нацкая сельская бібліятэка сеткі публічных бібліятэк Воранаўскага раёна *(бібліятэкар Л.Я. Бярцэвіч)*

**Заахвочвальная прэмія прысуджаная:**

Маларыцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы *(загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу Г.У. Кучына)*

Віцебскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя М. Горкага *(вядучы бібліятэкар аддзела бібліятэчнай рэкламы і маркетынгу С.А. Каржыцкая)*

Белагурнаўскай сельскай бібліятэцы сеткі публічных бібліятэк Дзятлаўскага раёна *(бібліятэкар К.М. Статкоўская)*

Клічаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы *(дырэктар І.У. Фіська)*

Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы *(галоўны бібліятэкар аддзела абслугоўвання і інфармацыі В.У. Шчарбакова)*

Мар'інагорскай гарадской бібліятэцы сеткі публічных бібліятэк Пухавіцкага раёна *(загадчыца Т.Д. Свірыдзенка)*

Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя П. Труса *(дырэктар А.У. Драчан)*

Смалявіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М. Багдановіча *(метадыст Н.М. Сёмуха)*

Чурлёнскай сельскай бібліятэцы сеткі публічных бібліятэк Вілейскага раёна *(бібліятэкар З.І. Карыба)*

Бібліятэцы – музею народнай творчасці і побыту в. Леванова сеткі публічных бібліятэк Барысаўскага раёна (бібліятэкар М.М. Несцяровіч).

***«Краязнаўчая газета» віншуе пераможцаў і зычыць поспехаў ім і ўсім удзельнікам конкурсу. Прыемна таксама, што сярод пераможцаў – і даўнія сябры і аўтары нашай газеты. Вітаем вас!***

# Бабульчыны ўспаміны

*(Заканчэнне. Пачатак у № 24)*

На белым кані з'явіўся мужчына ў чорным касцюме. Ён звярнуўся да нас на чыстай рускай мове: «Вас никто убивать не станет. Мы воюем против жидов и коммунистов. Среди вас есть такие? А от бандитов мы вас увезём. Вставайте и идите спокойно». Усе ўсталі, загаварылі пра фурманкі для рэчаў. Але ніхто з сабою нічога не браў.

Прывезлі нас у вёску Антунова, падвялі да хлява, сказалі ўзяць з сабою салому і зачынілі. Мама заплакала: «Будуць паліць».

Усю ноч ніхто не спаў, а раніцай пачалі выпускаць па два чалавекі па патрэбе. Побач стаяў немец з сабакамі. Выйшла і мама. У яе з плячэй упала хустка. Я была ўражаная: чорныя мамiны валасы сталі сівымі.

Нас паднялі ўсіх і пагналі. Прывялі ў Лепель, у ваенны гарадок, дзе размясцілі ў казармах на падлозе.

Раніцай усіх загналі ў рэчку, у халодную ваду. Мне было вады па шыю, таму мама мяне прыпадымала.

Потым нас зноў пагналі ў казармы. Кармілі так: адзін раз на дзень давалі суп з зялёнай капусты і маленькі кавалак горкага чорнага хлеба. Праз тыдзень людзі сталі хварэць (напэўна, ад холаду). Сталі казаць, што гэта тыф. Немцы гэтага слова баяліся. Тады я ўпершыню ўбачыла паліцаяў.

Мы патрапілі ў вёску Кальнікі. Жылі мы ў жанчыны з імем Агаша. У яе была дачка Анюта, мая равесніца. Гэтая жанчына да нас ставілася вельмі добра. Немцы ў вёсцы не з'яўляліся, а паліцаі вечарам і раніцай усіх пералічвалі. Так прайшло некалькі дзён.

Аднойчы дзядзька Васіль, мясцовы староста, сабраў усіх нас і ноччу вывеў з вёскі ў партызанскую зону, у вёску Малыя Дольцы. Агаша дала маме з сабой парася. Мама яго несла каля грудзей, каб не запішчаў. Вось так мы вярнуліся з палону, а дзядзька Васіль вярнуўся да сваёй сям'і. Потым нам стала вядома, што нас рыхтавалі для адпраўкі ў Германію.



*Бабуля Людміла і яе сям'я пасля вайны*

Да зімы мы жылі ў Малых Дольцах. Збіралі ўраджай, у асноўным познавечарам, бо днём ляталі нямецкія самалёты. Калі нешта ўбачаць падазронае ў полі – строчаць з кулямётаў. Гінулі людзі і жывёла. Усе нарыхтоўкі – збожжа, бульбу і іншае – партызаны забіралі з сабою ў лес. Тату абавязалі гнаць самагон. Самагон павінен быў быць вельмі моцны. Выраблялі яго для медыцынскіх патрэбаў.

Зімой 1943 года жылі ў зямлянках у сельскім лагеры, побач з партызанамі. Сяло наведвалі для таго, каб спекчы хлеб. Але загадзя трэба было разведаць, ці няма ў вёсцы немцаў. Яшчэ ў сяле праводзіліся мітынгі. Там выступала камсамолка Галя з Масквы. Гэта была маладая, прыгожая дзяўчына ў белым паўкажушку і кубанцы, аперазанай чырвонай стужкай.

Мясцовы паэт склаў песню і прысвяціў яе партызанцы Галі. Спявалі яе на мелодыю «Кацюшы». Там былі такія словы:

*Расцвітала*
*ліпеньскае ранне,*
*Пахла сена*
*кветкамі з лугоў.*
*Пайшла Галя*
*з сталінскім загадам*
*Паміж зоркіх*
*гітлераўскіх пастоў.*

*Ёй Радзіма дарага*
*і міла,*
*Гадавала маці на хвалу.*
*А Масква ёй*
*справу даручыла:*
*Біць фашыстаў*
*у яго тылу.*

Зімой 1944 года сям'і давялося перасяліцца ў глыб партызанскай зоны. Жылі ў вёсцы Папоўка. Немцы рыхтаваліся да блакады. Было вельмі трывожна. У лютым у мамы нарадзіўся сын Пётр. У пачатку красавіка сям'і зноў давялося сыйсці ў лес. Пачыналася вясна, было сыра, мокра і, фактычна, мы жылі ў балоце. Ноччу падмарожвала. А днём – туман і сырасць. Немцы акружылі партызанаў і ўсё насельніцтва, што было з імі. Днём пастаянна бамбілі, стралялі з гарматаў. Ад лесу амаль нічога не засталося, тырчалі толькі абломкі стваловў. Гінулі людзі. Распальваць вогнішча не дазвалялі. У мамы запазухай пастаянна быў прышпілены маленькі Пеця. Яго пялюшкі мама мыла ў лужы, а сушыла іх на сабе. У гэты час мы з братам Валодзем захварэлі на тыф.

У атрадзе ўжо і раней казалі пра прарыў нямецкай блакады. І вось надышла ноч прарыву. Першымі пайшлі партызаны. З імі пайшоў і наш бацька. Спачатку было ціха. А потым усё ўзарвалася, загрымела. Стаяў страшны грукат. Перыядычна з боку чыгункі ярка свяціў пражэктар. Потым пастуліла каманда для насельніцтва, і ўсе пабеглі. Калі ўключаўся пражэктар – усе падалі на зямлю і не варушыліся, а калі ён гас – усе зноў беглі ўперад. Мама мяне з Валодзем цягнула за рукі. Васіль бег папераде нас. Мне здавалася, што гэтаму пеклу не будзе канца.

Пасля вайны, калі ў гэтых мясцінах быў усталяваны мемарыяльны комплекс «Прарыў», мы з мужам праехалі па гэтай мясцовасці. Аказалася, што там не такая ўжо і высокая гара. А тады мне думалася, што мы бяжым пад высокую гару. Да гэтага часу дзіўлюся мужнасці маёй мамы: як яна змагла з гэтага пекла выцягнуць нас, сваіх чатырох дзяцей, і выратавацца сама.

Раніцай мы былі па-за зонай блакады. На нашым шляху апынулася вёска: людзей няма, дзверы ў дамах парасчыненыя. Мы патрапілі ў дом, дзе пахла печаным хлебам. Усе хлынулі ў гэты дом. Там і праўда ў яшчэ гарачай рускай печы быў хлеб.

Мы пакінулі гэтую вёску і зноў апынуліся ў Малых Дольцах. Амаль уся вёска была спаленая. Усе, хто выжыў, пасяліліся ў калгасным кароўніку. У вёсцы знаходзіліся і немцы, і паліцаі. Яны чамусьці называлі сябе «народнікамі».

Пра бацьку мы нічога не ведалі. Дзе ён? Ці жывы?..

Надышло лета 1944-га. І зноў – голад. Усе ямкі са схаваным збожжам былі раскрытыя і разрабаваныя.

Аднойчы на лузе я са стрыечнай сястрой Жэняй збіралі шчаўе. Побач немцы палілі для сябе лазню. Адзін з іх падышоў да нас і працягнуў часопіс з каляровымі малюнкамі. На адным са здымкаў мы пазналі ненавіснага Гітлера. Жэня (1934 г.н.) шпількай пракалола Гітлеру вочы. Часопіс мы вярнулі і пайшлі дадому. У хуткім часе да нас забег ашалелы немец і хацеў нас застрэліць. У доме ў той час сабралася шмат жанчынаў. Яны пачалі плакаць і прасіць не забіваць нас. Немец тут жа зняў рэмень і загадаў: «Пароць! Пароць!». Маці Жэні паспела некалькі разоў ударыць дачку рэменем, але Жэня ўцякла на гарышча. Мая мама плакала і лупіла мяне рэменем на вачах ва ўсіх. Немец хваліў яе: «Гут! Гут!» і паказваў, каб мама біла мяне металічнай спражкаю. У мяне на спіне яшчэ доўга заставаліся крывавыя падцёкі, і ўсё балела.

Мы з братам Валодзем захварэлі, цяпер ужо на адзёр. У гэты ж час адзін з «народнікаў» сказаў маёй маме: «Скажи жинкам, чтобы этой ночью попрятались в норы. Мы будем "тикать", а вас всех убьём». Мама ўсё гэта перадала людзям. Калі стала цямнець, усе ўцяклі ў лес. А раніцай за возерам каля вёскі з горкі мы ўбачылі нашых савецкіх салдатаў, якія беглі да нас і гучна крычалі: «Ура!». Усе выбеглі са сваіх схованў, смяяліся і плакалі. Салдаты пачаставалі нас хлебам і цукрам. Так прыйшло вызваленне.

І зноў быў голад, страшны, бясконцы.

Мама карміла маленькага Пецю грудзямі і пачала слепнуць ад бясхлебіцы. У калгасе была толькі адна карова. Тым мамам, у якіх былі малыя, да года, дзеці, давалі ў дзень па шклянцы малака.

Жанчынам за дзень трэба было ўскапаць рыдлёўкай 4,5 соткі зямлі. Хадзіць у лес па грыбы і ягады было небяспечна: па лесе бадзялася шмат немцаў і паліцаяў. Іх вылаўлівалі і саджалі ў склеп. Раней там была малатарня. Верхняя драўляная пабудова у вайну згарэла, а склеп у зямлі застаўся. Захаваліся і жалезныя краты на дзвярах. Туды часова саджалі злоўленых ворагаў. Потым іх ад нас кудысьці звозілі. Насельніцтва вымушанае было карміць паліцаяў і немцаў, што сядзелі ў склепе. Я памятаю, як наша мама прымушала нас з Валодзем насіць немцам вараны гарох.

Дзень перамогі памятаю вельмі ясна. Была халодная пахмурная раніца. Ішоў дробны дождж. За сялом на горцы жанчыны капалі свае 4,5 соткі. Раптам бачым: з горкі бяжыць і плача нашая мама. І крычыць, і плача, і смяецца: «Диты, война скончилася!».

Наш тата у час прарыву быў кантужаны, патрапіў у палон да немцаў і быў пагнаны ў Германію. Пазней у Германію былі пагнаныя мой брат Васіль і дзядзька Пеця. Там яны ўсе сустрэліся і пасля праходжання фільтрацыі (праверкі) разам вярнуліся на Радзіму. Гэта было восенню 1945 года.

*Запісаў*
***Аляксей ГАЎРЫЛІК,***
***вучань Ільянскай СШ***
***імя А.А. Грымаца***
***Вілейскага раёна***

№ 25 (378), ліпень 2011 года

# Мітрапаліт Мінскі і Беларускі Мельхісадэк

## *і Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква*

Міхал Львовіч Паеўскі нарадзіўся 15 лістапада 1879 года ў вёсцы Вітуліна Бельскага павета Холмскай губерні (цяпер Люблінскае ваяводства, Польшча) у сям'і Льва Сямёнавіча Паеўскага – святара, археолага, краязнаўцы. Міхась быў другім з дзевяці дзяцей у сям'і. З малых гадоў ён дапамагаў бацьку ў царкоўным служэнні. Маці казала, што «мальчик был с кружевной душой». Закончыў духоўную вучэльню, паступіў у Санкт-Пецярбургскую духоўную семінарыю, але з-за хваробы лёгкіх быў вымушаны пераехаць на поўдзень – у Сімферопаль. На апошнім курсе вучобы ў Сімферопальскай духоўнай семінарыі прыняў манаскі пострыг.

Пасля заканчэння семінарыі паступіў у Казанскую духоўную акадэмію, дзе на першым курсе прыняў мантыю з імем Мельхісадэк.У 1904 годзе, пасля заканчэння Казанскай духоўнай акадэміі, у званні кандыдата багаслоўя прызначаны выкладчыкам Магілёўскай духоўнай семінарыі па курсах асноўнага, дагматычнага і маральнага багаслоўя.

З 1904 года малады святар выконваў абавязкі кіраўніка Магілёўскага Брацкага Богаз'яўленскага манастыра. У 1906 годзе стаў ігуменам, а таксама сябрам Магілёўскага царкоўна-праваслаўнага брацтва. У студзені 1907 года пераведзены ў Бялыніцкі манастыр Магілёўскага павета ў сане архімандрыта, у верасні 1907 года – кіраўніком Херсонскага Свята-Уладзіміраўскага манастыра Таўрыцкай губерні, у 1909 годзе пераведзены ў Перамяненскі манастыр у Ноўгарад-Северскі Чарнігаўскай губерні. З 1910 года Мельхісадэк прызначаецца назіральнікам Уладзікаўказскага духоўнага вучылішча, у 1914 годзе – рэктарам Тыфліскай духоўнай семінарыі, дзе дазволіў праводзіць набажэнствы на грузінскай мове (роднай для большасці студэнтаў), чым выклікаў незадаволенасць мясцовых царскіх чыноўнікаў.

У 1916 годзе Мельхісадэк быў хіратанісаны ў Пецярбургскім Казанскім саборы ў епіскапа Кранштацкага, вікарыя Петраградскай епархіі, у чэрвені 1917 года стаў епіскапам Ладажскім.

У 1919 годзе епіскап Мельхісадэк вяртаецца на радзіму ў сане епіскапа Слуцкага, вікарыя Менскага. А напрыканцы 1919 года, з-за паспешлівага ад'езду епіскапа Георгія, прымае на сябе абавязкі епіскапа Менскага і Тураўскага (зацверджаны ў 1921 годзе), кіраўніка Беларускай епархіі ў складзе будучага СССР.

Архіепіскап Мельхісадэк заняў цвёрдую пазіцыю супрацьдзеяння абнаўленцтву і супраць ціску з боку АГПУ – з мэтаю схіліць да супрацоўніцтва.

У той час вельмі шырока абмяркоўвалася ідэя абвяшчэння Беларускай аўтаномнай праваслаўнай царквы, каторая была горача падтрыманая вернікамі і нацыянальнай інтэлігенцыяй, у тым ліку вядомым гісторыкам, дзяржаўным і грамадскім дзеячам Усеваладам Ігнатоўскім, класікамі беларускай літаратуры Якубам Коласам і Янкам Купалам. 23 ліпеня 1922 года з ініцыятывы епіскапа Мельхісадэка быў скліканы сход беларускага праваслаўнага духавенства, дзе ён выступіў з Дэкларацыяй аб аўтаноміі Беларускай Праваслаўнай Царквы.



Была створаная новая структура кіравання царквою – Царкоўнае Упраўленне Беларусі (ЦУБ). Яе прадстаўнікі С. Касцючэнка і У. Сакалоў выехалі ў Маскву з мэтаю зацвярджэння вынікаў з'езда. Аднак ЦУБ і Мітрапаліт Мельхісадэк у новым чыне не былі зацверджаныя. Адказ аргументаваны тым, што на той час (1922 год) Беларуская Праваслаўная Царква складалася з адной епархіі, а сама БССР – толькі з тэрыторыі Міншчыны, а для стварэння аўтаномнай царквы адной епархіі недастаткова, тым больш, калі такая аўтаномія абвяшчаецца без санкцыі цэнтральнага кіравання. Вышэйшае Царкоўнае Упраўленне (ВЦУ), якое кіравалася абнаўленцамі, не было зацікаўленае ў асобе Мітрапаліта Мельхісадэка, з яго актыўным супрацьдзеяннем абнаўленцтву, і таму пастаянна аказвала ціск на іерарха і царкоўнае кіраўніцтва Беларусі. Аднак Мінская епархія заставалася невялічкай выспай у бурапенным моры абнаўленцтва. А ў той жа час на Віцебшчыне і Гомельшчыне, што знаходзіліся ў складзе Савецкай Расіі, абнаўленцы мелі значны ўплыў. Пры ўзбуйненні БССР у 1924 годзе, калі Віцебшчына і Гомельшчына былі далучаныя да БССР, Беларуская Праваслаўная Царква ўзрасла за кошт дзвюх епархіяў, цалкам абнаўленцкіх. У БПЦ быў створаны абнаўленцкі Сінод. Але кіроўная структура, якую ў той жа час узначальваў Мітрапаліт Мельхісадэк, называлася Беларускім Епархіяльным Упраўленнем (БЕУ), імкнулася пашырыць свой уплыў на ўсю тэрыторыю Беларусі.

Мітрапаліт Мельхісадэк праводзіў самастойную і незалежную царкоўную палітыку і вёў паспяховую барацьбу з абнаўленцамі, НКУС аказваў на БЕУ ціск. У выніку супраць Мельхісадэка была ўзбуджаная крымінальная справа «аб утойванні царкоўных каштоўнасцяў», і ён быў змешчаны пад хатні арышт. І ва ўмовах хатняга арышту ён працягваў кіраваць Беларускай епархіяй, яго падтрымлівалі тры вядомыя епіскапы: Бабруйскі – Філарэт (Раменскі), Слуцкі – Мікалай (Шамяціла), Мазырскі – Іван (Пашын). Яны наладжвалі праваслаўнае жыццё ў далучаных епархіях, супрацьдзейнічалі абнаўленцам.

У 1925 годзе расследаванне па справе завершылася. Мітрапаліту і яго паплечнікам пагражала турэмнае пакаранне, але з-за таго, што ў Маскве не вельмі зацікавіліся гэтай справаю, а супраць Мельхісадэка сярод яго атачэння не ўдалося «выбіць» абвінаваўчых сведчанняў, быў вынесены прысуд аб пазбаўленні Мітрапаліта Мельхісадэка волі на тры гады ўмоўна, а яго аднадумцаў і паплечнікаў – на 1–2 гады ўмоўна. Але ў снежні 1925 года Мельхісадэк быў пасаджаны ў Бутырскую турму (Масква), адкуль быў вызвалены 4 мая 1926 года.

У час зняволення Мельхісадэк падтрымаў рух, які ўзначальваў архіепіскап Свярдлоўскі Грыгорый (Яцкоўскі). Гэты рух пазней названы расколам. Ён выступаў за аднаўленне саборнага кіравання Рускай (фактычна Расійскай) Праваслаўнай Царквою, для аднаўлення якога былі створаны Часовы вышэйшы Сінод. Ёсць сведчанні пра тое, што ў час знаходжання мітрапаліта ў турме «грыгарыянскі» раскол быў арганізаваны супрацоўнікам АГПУ Тучковым. Мельхісадэк выйшаў з гэтага расколу пасля вызвалення з турмы. У чэрвені 1926 года пакаяўся перад Мітрапалітам Сергіем (Страгародскім) і падаў прашэнне аб складанні сана мітрапаліта, застаўшыся ў сане епіскапа.

Неўзабаве Мельхісадэк быў арыштаваны і высланы ў Сібір. Да вясны 1927 года ён знаходзіўся на Марыінскіх пасяленнях. Пасля вяртання з пасяленняў 23 мая 1927 года быў зноў затрыманы і арыштаваны органамі бяспекі «за выкарыстанне рэлігійнага руху ў антысавецкіх мэтах». Зноў вызвалены з турмы 17 верасня 1927 года з падпіскай аб нявыездзе. На пачатку 1928 года быў прызначаны архіепіскапам Енісейскім і Краснаярскім і зноў адправіўся ў Сібір, дзе служыў у кафедральным саборы. Ён вельмі сумаваў па радзіме, але ў Беларусь так і не змог вярнуцца.

Вядома, што ў 1930 годзе мітрапаліт быў выкліканы ў Маскву, дзе на летняй сесіі абраны ў Сінод. 17 мая 1931 года ён раптоўна памёр (магчыма, атручаны) пры нявысветленых акалічнасцях пад час службы ў кафедральным Дарагамілаўскім Богаз'яўленскім саборы (паводле іншых звестак – у час службы ў Пакроўскім храме).

Першапачаткова быў пахаваны ў Кузьмінках (Масква) на Сямёнаўскіх могілках. Пазней прах беларускага мітрапаліта быў перапахаваны на Перамяненскіх могілках (Масква). На яго магіле ўстаноўлены мармуровы крыж. Залічаны да ліку святых айцоў-вялікапакутнікаў РПЦ.

Мельхісадэк пакінуў нам нямала сваіх працаў: гістарычны нарыс «Участие правительственной власти (в лице генерал-губернатора) в восстановлении православия в Северо-Западном крае 1839–1867 гг.»; «Речь при наречии его во епископа Кронштадского»; «Слово о входе в Иерусалим»; «Божьей милостью».

Ягоныя духоўны скарб і намаганні не засталіся марнымі. Справу мітрапаліта падоўжылі аднадумцы і паслядоўнікі.

9–10 жніўня 1927 года ў Менску адбыўся з'езд прадстаўнікоў праваслаўнага духавенства і вернікаў на чале з епіскапам Бабруйскім Філарэтам (Раменскім), які абвясціў стварэнне Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы. Быў прыняты «Статут Саюза Праваслаўных старацаркоўніцкіх суполак у сваёй сукупнасці, якія складаюць Беларускую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву». У 1930–1940 гады абсалютная большасць вернікаў і духавенства была рэпрэсаваная, а царкоўнае жыццё амаль поўнасцю было задушанае. Толькі ва Усходняй Беларусі бальшавікамі знішчаныя каля 2 500 праваслаўных цэркваў і манастыроў.

У верасні 1942 года (пад час акупацыі) у Мінску адбыўся царкоўны Сабор Беларускай мітраполіі, на якім быў прыняты новы Статут Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы.

У пасляваенныя гады большасць святароў БАПЦ была арыштаваная і пасаджаная ў турмы, але частка працягвала сваю духоўную місію як падпольная і вандроўная царква. І толькі з абвяшчэннем сувэрэнітэту Рэспублікі Беларусь у 1991 годзе ажывілася і дзейнасць Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы.

Каб прызнаць Беларускую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву і Мітрапаліта Мінскага і Беларускага Мельхісадэка як вышэйшага іерарха гэтай царквы ў 20-я гады XX стагоддзя, у Беларусі – ужо ў наш час – рабілася некалькі спробаў.

Каля 20 гадоў таму ў Мінску быў створаны прыход Афрасінні Полацкай Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы. Усе патрэбныя дакументы і даведкі былі падрыхтаваныя і пададзеныя на зацвярджэнне ў розныя ўладныя структуры. Адмова за адмовай... Ні ў адной з інстанцыяў яны не былі зацверджаныя.

Шмат захадаў рабіла і кандыдат філасофскіх навук Таццяна Процька, каб прызнаць Мельхісадэка Мітрапалітам Мінскім і Беларускім БАПЦ. У 1996 годзе яна ў мінскім выдавецтве «Навука і тэхніка» НАН Беларусі выдала кнігу «Пакутнік за Веру і Бацькаўшчыну», прысвечаную жыццю і дзейнасці Мельхісадэка. Некалькі разоў быў на прыёме ва Уладыкі Філарэта па пытанні ўвекавечвання памяці Мельхісадэка і ўстаноўцы помніка або мемарыяльнай дошкі старшыня клуба «Спадчына» Анатоль Белы. І таксама безвынікова.

Пра Мельхісадэка ў сваіх кнігах пісалі Мітрапаліт Віленскі Елеўферый, архіепіскап А. Мартас, святар Ф. Крыванос, навукоўца Уладзімір Навіцкі і многія іншыя.

***Айцец***
***Леанід АКАЛОВІЧ,***
***святар Свята-Афрасінінскай суполкі БАПЦ***

***(Друкуецца з захаваннем некаторых асаблівасцяў напісання аўтарам імёнаў і назваў)***

# Вынікі «Купалаўскіх вакацыяў»

***У сярэдзіне чэрвеня ў філіяле Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы ў Вязынцы адбыўся фінал конкурсу аўтарскай песні «Купалаўскія вакацыі», у якім прынялі ўдзел гурты, асобныя аўтары і выканаўцы, адабраныя журы на этапах «вакацыяў».***

Апярэдадні бардаўскага конкурсу ў выставачным пакоі гаспадарчай пабудовы, на прыступках якой заўжды ладзяцца Купалаўскія мерапрыемствы, адбылася прэзентацыя фотавыстаўкі «Святло як мера часу» фотамастака Джона Кунстадтэра, вядомага па фотаблогу www.radzimafoto.com і аздабленні музычнага альбома Алеся Камоцкага «Вяровіца».

У фінальным канцэрце выступілі 10 канкурсантаў. Сярод іх – ужо вядомы па ўдзеле у леташнім конкурсе Міхась Бараноўскі з гуртом «Нельга забыць» з Мінска, які атрымаў прыз глядацкіх сімпатыяў у першым туры сёлетняга конкурсу. Гурт разнапланавы: грае фольк, фольк-рок, эксперыментуе ў спалучэнні фальклору з сучаснай электроннай музыкай. Сярод дасягненняў – стварэнне арыгінальнай праграмы «Леаніды не вернуцца на Зямлю» (музычных інтэрпрэтацыяў рамана Караткевіча «Нельга забыць»). Акрамя ўласных песень аўтары пішуць музыку на словы класікаў беларускай літаратуры. З пачаткоўцаў «вакацыяў» свае конкурсныя творы праспявалі Сяргей Башлыкевіч, Раман Абрамчук & Co, Павел Дабрыян, Аляксей Нежавец, Арцём Сітнікаў, Ганна Валынец і гурт «НебаСгу», Юрась Раманоўскі, Валодусь Пыльчанка і гурт «Пацукі», Ханна Чумакова.



*Джон Кунстадтэр на адкрыцці выстаўкі*



*Сяргей Башлыкевіч*

«Купалаўскія вакацыі» – адзіны ў краіне конкурс беларускамоўнай аўтарскай песні. Асноўнымі мэтамі конкурсу, які праводзіўся ўжо другі раз, з’яўляюцца папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, Купалавай спадчыны, беларускай мовы, літаратуры, а таксама прыцягненне наведнікаў у купалаўскія мясціны. Галоўная ўмова для канкурсантаў – выкананне песень на беларускай мове.

Аўтарытэтнае журы на чале з дырэктарам Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Аленай Мацевасян у складзе: вядомых бардаў Алеся Камоцкага і Вольгі Акуліч; музычнага крытыка, журналісткі Беларускага радыё Надзеі Кудрэйка; паэткі і журналісткі газеты «СБ. Беларусь Сегодня» Людмілы Рублеўскай; а таксама фундатараў – прадстаўніцы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў культуры Алены Гук, галоўнага спецыяліста аддзела культуры Маладзечанскага райвыканкама Тамары Дудзіч, генеральнага дырэктара турыстычнай кампаніі «Pegas Touristik» Паліны Хадкевіч, фотамастака, дырэктара выдавецтва «Рыф-тур», шэф-рэдактара газеты «Туризм и отдых» Сяргея Плыткевіча вызначала пераможцаў у сямі намінацыях.

У намінацыі за лепшае выкананне песні «За годам год» на словы Янкі Купалы перамог Арцём Сітнікаў з Івацэвічаў, сёлетні выпускнік прыборабудаўнічага факультэта БДПА і будучы інжынер-метролаг.



*Ханна Чумакова*

За лепшую аўтарскую песню ўзнагароджаны Сяргей Башлыкевіч з Ашмянаў, былы выпускнік, а зараз выкладчык і магістрант БДУІР, які выканаў песні па матывах твора Уладзіміра Караткевіча і пра паўстанцаў-касінераў. Акрамя дыплома ён атрымаў спецыяльны прыз ад выдавецтва «Рыф-тур».

За лепшае спалучэнне тэксту і музыкі ўзнагародзілі Міхася Бараноўскага і гурт «Нельга забыць».

Прыз ад «СБ. Беларусь Сегодня» «За лепшую прэзентацыю песні» атрымала паэтка і бард Ханна Чумакова, якая працуе дэкаратарам мінскага ўнівермага «Беларусь».

Знайшлі сваіх уладальнікаў і спецыяльныя прызы ад фундатараў конкурсу. Прыз «Надзея» ад аддзела культуры Маладзечанскага райвыканкама атрымаў гурт «Пацукі» і Валодусь Пыльчанка. Ён самы малады ў гурце (каля двух месяцаў) і сярод удзельнікаў. Сярэдні ўзрост музыкаў – 16 з паловаю гадоў. Хлопцы з гарадскога пасёлка Акцябрскі, а зараз навучаюцца ў Ліцэі БДУ. Іх музычныя кампазіцыі вылучаюцца незвычайнай выразнасцю, вобразнасцю і дынамічнасцю.

Прыз «За вернасць традыцыям» ад заснавальнікаў атрымаў вядомы аўтар-выканаўца, кампазітар, аранжыроўшчык і паэт Аляксей Нежавец – шматразовы лаўрэат і дыпламант фестываляў аўтарскай песні ў Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі.

Не абышлося і без заўсёдніка чэрвеньскіх купалаўскіх мерапрыемстваў – моцнага дажджу, які, мабыць, адгукнуўся на лірычную і вельмі кранальную песню пераможцы «вакацыяў» Арцёма Сітнікава:

*Па мокрым шкле*
*цэлы дзень*
*Плаўна спаўзаюць*
*сьлёзы-сьляды...*
*Ці быў узыход, ці агмень –*
*Я помню гукі –*
*песьню вады...*
*Дождж...*

Чарговы конкурс «Купалаўскія вакацыі» адбудзецца ў наступным годзе, калі краіна будзе святкаваць 130-годдзе Янкі Купалы. Спадзяемся, што кола ўдзельнікаў, прыхільнікаў і фундатараў «Купалаўскіх вакацыяў» значна пашырыцца.

**С. АЛАВЕЙКА**
***Фота аўтара і Уладзіміра СІЗА***



*На сцэне гурт «Пацукі»*

## Купалаўскія дні

*Не дайце згінуць песняру*
*У нязнанні, ў беднасці, ў глушы.*
*Стварыце радасці зару,*
*Зганіце сум з яго душы...*

**Янка Купала**

Штогод у канцы чэрвеня – таго самага месяца, калі пачалося і калі заўчасна абарвалася жыццё вялікага беларуса Янкі Купалы, у дні, якія замацаваліся ў нашай свядомасці як Купалаўскія, грамадскасць ушаноўвае памяць Песняра. І як заўсёды, Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы запрашае аддаць даніну памяці сапраўднаму сыну Бацькаўшчыны.

Пачаліся Купалаўскія дні 28 чэрвеня «Жальбінамі». Прыхільнікі таленту паэта ўсклалі кветкі да помніка Янку Купалу на мінскіх Вайсковых могілках, а ўвечары адбылася святая імша ў Архікафедральным касцёле Найсвяцейшай Панны Марыі (у дзень 69-й гадавіны яго смерці).

Працягнуцца мерапрыемствы 6 ліпеня ў памяшканні Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. А 17-й гадзіне адбудзецца прэзэнтацыя Першага выставачнага праекта «Дзеці Дона малююць Беларусь». З 18 да 23 гадзінаў – «Купальская ноч у Купалавым доме», дзе моладзь аб’ядная купальскія песні з элементамі традыцыйнага абрадру, пакажа старадаўнія беларускія танцы, будзе плесці купальскія вянкі, шукаць папараць-кветку, а таксама прадставіць сучаснае прачытанне твораў класіка ў інтэрпрэтацыі вядомых маладых выканаўцаў.

7 ліпеня ў мінскім парку імя Янкі Купалы пройдзе музычна-літаратурны зварот да творчасці Песняра «Палымянае слова Паэта», адбудзецца ўскладанне кветак да помніка класіку.

У філіяле музея «Вязынка» на радзіме Янкі Купалы 9 ліпеня з 12 да 17 гадзінаў ладзіцца традыцыйнае Свята паэзіі, песні і народных рамёстваў «З адною думкаю аб шчасці Беларусі…».

Ушануем разам памяць Янкі Купалы, якому лёс наканаваў прынесці і ў наш час свае ідэі, вобразы, прароцтвы!..

***Паводле інфармацыі арганізатараў***

*Для экскурсаводаў, і не толькі*

# Уладары Пастаўскіх маёнткаў

*(Заканчэнне. Пачатак у №№ 22–24)*

## Пшаздзецкія

Райнольд Тызенгаўз не меў нашчадкаў і сваё багацце пасля смерці (1881) пакінуў сястры Марыі, якая была замужам за вядомым гісторыкам і пісьменнікам Аляксандрам Пшаздзецкім. Марыя нарадзілася ў 1823 годзе, атрымала добрае прыватнае выхаванне. Ад бацькі навучылася музыцы, маляванню і арніталогіі. Брала ўрокі жывапісу ў самога Дэлакруа, заснавальніка французскага рамантызму. Альбом з уласнымі выявамі кляштараў і касцёлаў яна падаравала Папу Рымскаму Леону XIII на яго залаты юбілей. Магчыма, гэта была свайго роду ўдзячнасць Папу за дазвол выйсці замуж за Аляксандра Пшаздзецкага. Жаніх даводзіўся Марыі стрыечным братам і з прычыны роднасці крыві дазвол на шлюб трэба было браць у Рыме. Вяселле адбылося ў апартаментах бабулі нявесты Марыяны Тызенгаўз з Пшаздзецкіх у Варшаве 24 лістапада 1842 года. Разам з мужам Марыя жыла ў Італіі, Францыі, Польшчы; Паставы наведвала вельмі рэдка. У 1871 годзе аўдавела. Займалася дабрачыннасцю, шмат грошай ахвяравала на мастацтва, на будаўніцтва і падтрымку касцёлаў. З яе фундацыі быў узведзены касцёл Св. Антонія Падуанскага ў Паставах, яна ж дала 5000 злотых праваслаўным вернікам на будаўніцтва царквы ў мястэчку пасля таго, як стары храм згарэў.

Памерла Марыя Тызенгаўз-Пшаздзецкая ў 1890 годзе ў Варшаве. У шлюбе з А. Пшаздзецкім мела сыноў Канстанціна і Густава.

Пасля смерці М. Пшаздзецкай маёмасць перайшла ў спадчыну спачатку да яе старэйшага сына Канстанціна, які ў шлюбе з Эльжбетай Плятэр-Зыберг меў пяць сыноў і дзвюх дачок. Канстанцін памёр у 1896 годзе, і маёмасць была падзеленая паміж ягонымі нашчадкамі. Паставы дасталіся Юзафу (старэйшаму сыну), маёнтак Варапаева – Канстаціну, маёнткі ў Польшчы – Стэфану, малодшаму Райнольду – маёнткі ў Латвіі і Літве. Варта адзначыць, што апошні з Тызенгаўзаў – уладальнікаў Паставаў Райнольд яшчэ перад сваёй смерцю ў 1880 годзе запісаў маёнтак унуку сваёй сястры Марыі Юзафу Пшаздзецкаму, які нарадзіўся ў 1872 годзе.

Браты Юзаф і Канстанцін клапаціліся пра эканамічнае развіццё Пастаўшчыны. Пры іх удзеле была пабудаваная вузкакалейка паміж Панявежам (Новасвянцяны) і Глыбокім (Круляўшчына), якая стымулявала развіццё гаспадаркі. Пшаздзецкія былі і самымі буйнымі землеўласнікамі: ім належала каля 16,5 тысячы дзесяцінаў зямлі. Акрамя таго, браты дабіліся пацвярджэння графскага тытула, якое атрымалі 21 студзеня (па старым стылі) 1913 года ад Мікалая II.



*К. Пшаздзецкі*

Значную ролю ў пастаўскай спадчыне Тызенгаўзаў-Пшаздзецкіх адыграў малодшы з братоў – Райнольд. Вялікі ўплыў на яго выхаванне аказала бабуля Марыя Пшаздзецкая і, магчыма, таму ён больш за іншых клапаціўся за тыя мастацкія каштоўнасці, якімі валодаў іх род. У 1914 годзе, перад Першай сусветнай вайной Райнольд перавёз у Варшаву на вуліцу Фоксаль фамільны архіў Тызенгаўзаў. У 1917 годзе ў час рэвалюцыйных падзеяў спрабаваў уратаваць вялікую бібліятэку, перавёзшы яе з Паставаў у Смаленск. Далейшы лёс бібліятэкі пакуль што не выяўлены.





*Афіцэрская (армейская) школа ў Паставах (пач. XX ст.)*

Наступленне Чырвонай Арміі 17 верасня 1939 года застала Райнольда Тызенгаўза ў Паставах. Перш чым назаўжды пакінуць родныя мясціны, ён выкупіў у Вільні ў антыкварных крамах кнігі свайго славутага дзеда і заехаў у радавы маёнтак Рокішкі, каб забраць некалькі палотнаў сямейнай калекцыі. Жыў спачатку ў Швецыі, пазней – у Швейцарыі. Напісаў цікавую манаграфію пра дзеда «Аляксандр, граф Пшаздзецкі (1814–1871): Сямейныя ўспаміны аб яго жыцці і справах».

Райнольд Пшаздзецкі пастаянна памятаў, што яго род вымірае, таму імкнуўся пакінуць як мага болей звестак аб сваёй фаміліі. У ягоных архівах засталіся запісы, якія сведчаць, што ён меў намер напісаць манаграфію пра Паставы. Адзінокі і невылечна хворы, ён памёр у бальніцы Лазаны ў 1955 годзе.



*Ігар ПРАКАПОВІЧ*





# Сустрэчы ў Здраўнёве

***Сёлета ў ліпені Здраўнёва збіраюцца наведаць спадкаемцы мастака Ілы Рэпіна (ажно 19 чалавек), якія жывуць у Францыі. Яны таксама наведаюць родны куток мастака – горад Чугуеў ва Украіне, дзе ёсць мемарыяльны музей знакамітага майстра, а таксама ў Расіі – музей-сядзібу Рэпіна «Пенаты» непадалёк Санкт-Пецярбурга, Траццякоўскую галерэю ў Маскве і Рускі музей у Пецярбургу, дзе захоўваюцца арыгіналы шэдэўраў жывапісца.***

***У Пецярбургу ўтварыўся клуб прыхільнікаў «Здраўнёва». Ім кіруе мастацтвазнаўца і гісторык Наталля Баклан. Госці з берагоў Нявы ўжо прывезлі ў падарунак музею звыш 200 рэчаў XIX – пачатку XX ст. Наталля Віктараўна і клубныя сябры нядаўна зноў пабывалі ў Здраўнёве і прывезлі новыя каштоўныя рарытэты.***

Радуе, што ў Беларусі сёння ўсё больш актыўна развіваецца айчынны турызм, а на зямлі сінявока-азёрнага Прыдзвіння ёсць адно месца – проста ўнікальнае і казачнае. Гэта музей-сядзіба «Здраўнёва» непадалёк ад Віцебска на правым беразе Заходняй Дзвіны.

Тут з 1892 па 1900 год праводзіў свае летнія сезоны мастак Ілья Яфімавіч Рэпін. Яму належалі каля 120 га зямлі і лесу. Сядзіба мастака складалася з жылых дамоў, флігеля, гаспадарчых пабудоваў, парку, саду са штучным вадаёмам. Сюды часта наведваліся сваякі, сябры і знаёмыя мастака, вучні, паслядоўнікі і прыхільнікі яго таленту (А.Г. Яўленскі, К.А. Вяшчылаў, І.М. Трапічнікаў, М.Я. Барысаў і інш.).

У Здраўнёве майстра напісаў больш за 60 карцінаў і малюнкаў. Менавіта на гэтай прыгожай прыдзвінскай зямлі ён стварыў карціны «Беларус», «Восеньскі букет» (партрэт В.І. Рэпінай), «Паляўнічы», «На Заходняй Дзвіне. Усход сонца» (усе 1892), «Касец-літвін» (1894), «Дуэль», «Месячная ноч», «Паненкі на прагулцы сярод статка кароў», «Партрэт сына Юрыя на тэрасе здраўнёўскага дома» (усе 1896), «На сонцы» (1900), а таксама шэраг пейзажаў і партрэтаў беларускіх сялянаў. І штовосень у музеі адбываецца прыгожае свята ў гонар самай лірычнай карціны здраўнёўскага перыяду – «Восеньскі букет».

У 1918–1930 гадах у Здраўнёве жыла сям'я малодшай дачкі мастака Т.І. Рэпінай-Язевай, якая з дачкой і зяцем настаўнічалі ў пачатковай школцы. На другім паверсе музея дэманструюцца ўзоры падручнікаў таго часу, па якіх займаліся дзеці тутэйшых сялянаў.

Тэма Заходняй Дзвіны надзвычай захапіла мастака. У Траццякоўскай галерэі ў Маскве захоўваецца малюнак Рэпіна «Бурлакі на Дзвіне» – менш вядомы шырокай грамадскасці, чым яго карціна «Бурлакі на Волзе». У Нацыянальнай галерэі ў Празе знаходзіцца малюнак «Святочнае гулянне ў Здраўнёве». Рэпін гэткае гулянне наладжваў у сядзібе 20 ліпеня (стары стыль. – **«КГ»**) у дзень сваіх імянінаў, на Іллю. Ён запрашаў да сябе суседзяў – памешчыкаў, святароў, сялянаў. Сёння ў музеі таксама адзначаецца Ільін дзень – 2 жніўня. Далёка па-за межамі Беларусі вядомая карціна Рэпіна «Беларус». Цікава, што для яе пазіраваў жыхар суседняй вёскі Сахарава Сідар Шаўроў.

Музей па праекце мінскага архітэктара Паўла Кракалёва быў адкрыты ў 1989 годзе. Комплекс музея-сядзібы ўключае: дом, у якім працуе мемарыяльная экспазіцыя; дом аканома (тут размясціліся адміністрацыя і выставачная зала); склеп; сажалку; частку ліпавай прысады. Дарэчы, ліпы – самыя старажытныя ў сядзібе, яны пасаджаныя рукой знакамітага майстра. Была ў мастака і ялінавая прысада, яна нанава адсаджаная.

З 1992 года ў Здраўнёве праводзяцца рэпінскія пленэры. У 2009 годзе ў музеі была адкрытая Школа юнага мастака краін СНД.

І як добра, што з кожным годам становіцца ўсё больш наведнікаў музея і прыхільнікаў таленту бессмяротнага Рэпіна. Нават у час вяселля многія маладыя пасля загса робяць падарожжа ў Здраўнёва, каб сфатаграфавацца ва ўлонні яго прыроды. Упэўнены, што на такой прыгожай зямлі проста не можа не нарадзіцца шчаслівай новая беларуская сям'я!

***Канстанцін КАРНЯЛЮК,***
***краязнаўца,***
***г. Віцебск***

# Лёсы неўтаймаваных

***Шмат важных гістарычных падзеяў адбывалася ў нашай краіне. Захоўваецца памяць і пра людзей, якія іх здзяйснялі. Цікава даведацца, як склаўся іх лёс. Вось, напрыклад, лёс сына дэлегата I з'езда РСДРП, нашага земляка з Душава Казіміра Адамавіча Петрусевіча.***

Нарадзіўся Казімір Казіміравіч Петрусевіч у Мінску, калі бацька пасля арышту за ўдзел у рэвалюцыйным руху 1905 года вярнуўся з сібірскай ссылкі. Неўзабаве маці Яліна (з роду Наркевічаў-Ёдкаў), вядомая сацыял-дэмакратка, каб пазбегнуць арышту, разам з маленькім Казімірам эмігравала ў Швейцарыю. Потым яны вярнуліся на радзіму, дзе трапілі ў ліхалецце Першай сусветнай, а ў разгар грамадзянскай сям'я Петрусевічаў блукала па Украіне. Падлетак Казя згубіў там сваіх родных, цудам выжыўшы. Ён убачыў на сваё вочы, як усталёўваць савецкую ўладу, сутычкі з белагвардзейцамі, махноўцамі, пятлюраўцамі. Сын рэвалюцыянера хутка мужаў, атрымліваў жыццёвую закалку, якая спатрэбілася ў далейшым. Неўзабаве добрыя людзі падказалі шукаць бацькоў у Польшчы, якіх ён і знайшоў у Варшаве ў 1920 годзе.

Потым Казімір паступіў у Віленскі ўніверсітэт, дзе ўвайшоў у кола актывістаў нелегальнай антыфашысцкай арганізацыі «Фронт» (акрамя яго, на першых ролях там былі Уладзімір Лянкевіч, Ян Капала). Цікава, што сябры Петрусевіча-малодшага вялі свае дыскусіі ў тым самым базыльянскім манастыры, дзе калісьці гуртаваліся філаматы і філарэты – дух свабоды працягваў жыць. Універсітэт ён закончыў на выдатна. А потым давялося пабыць у доўгіх марскіх вандроўках: быў матросам на польскіх марскіх суднах, спазнаваў свет. Хлопец удзельнічаў у страйках партовых рабочых у Гдыні, за што сядзеў у турме. Давялося працаваць і шахцёрам на вугальных шахтах у Ардэнах.

Максім Танк вельмі цёпла згадваў абодвух Петрусевічаў: у 1934 годзе Петрусевіч-старэйшы выступаў абаронцам паэта на судзе ў Вільні, а праз год (Танка апраўдалі) стаў працаваць у газеце «Попросту», якую арганізаваў малодшы Петрусевіч. Газета выдавалася пры падтрымцы ЦК Кампартыі Заходняй Беларусі і карысталася аўтарытэтам у чытачоў. А ў пачатку 1936 года адбыўся судовы працэс над малодшым Петрусевічам, але справа развалілася, і ён быў апраўданы. Дарэчы, у тым жа Віленскім судзе вялася справа і Сяргея Прытыцкага, дзе той стрэліў у правакатара. Але і вядомага камуніста цяжка паранілі. З суда яго прывезлі ў шпіталь, а пасля лячэння прыгаварылі да расстрэлу. Удзельнікі «Фронту» прыдумалі план вызвалення: Казімір Казіміравіч з братам Данікам падрыхтавалі лодку, каб перавезці вязня праз раку Вілію. Але Прытыцкага перавезлі ў турэмны шпіталь пад надзейную ахову. Петрусевіч з сябрамі ажыццявіў іншы план: рэвалюцыянера атрымалася выратаваць. Пракурор падаў новую скаргу, і судовы працэс над малодшым Петрусевічам адбыўся ў Варшаве. Перад ім Казік параіўся з бацькам-адвакатам, як быць: ці падаваць прашэнне польскаму прэзідэнту аб памілаванні, ці з гонарам прыняць кару. «У мой час мы заяву цару не падавалі», – адказаў Казімір Адамавіч.



*Казімір Петрусевіч з жонкай Янінай*



*Пётр Румянцаў*

У верасні 1939 года сябры Петрусевіча арганізавалі рабочую міліцыю і стварылі савецкую ўладу ў Вільні. Але яе ён так і не зразумеў: за што павесілі ярлык сацыял-фашыста Даніку (брату Казіміра) і расстралялі, чаму была распушчаная кампартыя Заходняй Беларусі, а многія члены рэпрэсаваныя.

Другую сусветную вайну Казімір Казіміравіч сустрэў дырэктарам Мальковіцкай школы на Палессі. Ён выграшыў схавацца ў сябрoў. На нейкі час гэта і выратавала Петрусевіча, а вось ягонага сябра Генрыха Дзянбінскага (вядомага дзеяча камуністычнага падполля) карнікі схапілі і расстралялі. Высачылі і Казіміра, замкнулі ў памяшканнях чыгуначнай станцыі Маскавічы. Вязняў выводзілі з цямніцы па адным і расстрэльвалі. Дайшла чарга і да Казіміра. Ахоўнік адчыніў дзверы і раптоўна ўпусціў аўтамат. Вязень выкарыстаў гэты момант: прысеў і кінуўся ўбок, пакаціўся і – у кусты, у лес. Блукаючы па лесе, натрапіў на легендарны атрад Кірылы Арлоўскага, які спытаў змучанага параненага хлопца, ці хоча той змагацца з немцамі. Адказ быў станоўчы, і Казімір Казіміравіч быў прызначаны ў разведку.

Петрусевіч потым расказваў, як іх партызанскі атрад высачыў віцэ-гаўляйтара Беларусі Фрыдрыха Фейнца. Апошні прыехаў са світай палявааць на дзіка. Партызаны закідалі гранатамі немцаў. Тады быў цяжка паранены Кірыла Арлоўскі, і яго беспрытомнага занеслі ў зямлянку. Аперацыю ўрач праводзіў з дапамогай нажоўкі, а дапамагаў Петрусевіч. Здзівіла сіла волі камандзіра, які без наркозу ўсё вытрымаў. Арлоўскі застаўся без рукі, а на другой захаваўся адзін палец.

Пасля вайны Петрусевіч-бацька, Казімір і сваякі пераехалі з Заходняй Беларусі ў Польшчу. Петрусевіч-старэйшы разумеў, што ніякія заслугі не ратуюць яго ад НКУС, нават у Польшчы, бо ўжо шматлікія актывісты былі высланыя ў Магадан. Казіміра Адамавіча шанавалі ў Варшаве, і сёння яго імя ўключаюць у даведнікі і кнігі па гісторыі. Ён выбіраўся членам Вярхоўнага Суда Польскай Народнай Рэспублікі, атрымаў ад урада вышэйшую ўзнагароду краіны – ордэн «Адраджэнне Польшчы». Памёр наш зямляк 14 жніўня 1949 года.

Петрусевіч-сын таксама не быў абдзелены ўвагай. У маладой дзяржаве быў намеснікам міністра марскога флоту, меў поспехі ў навуцы. Падтрымліваў сувязі з Андрэем Анчуцыным, які стаў вядомым амерыканскім вучоным.

К.К. Петрусевіч шмат зрабіў для адраджэння Польшчы: стварыў Інстытут экалогіі, быў членам прэзідыума Акадэміі навук, вядомым грамадскім дзеячам, выпрацаваў шэраг прапаноў па ахове навакольнага асяроддзя. Неаднаразова быў удзельнікам міжнародных сімпозіумаў у Маскве і Мінску.

У канцы 1970 – пачатку 1980 гадоў яго запрасілі ў Мінск на здымкі фільма пра беларускіх партызанаў. На мінскім вакзале акадэміка чакаў незвычайны сюрпрыз. З дынаміка прагучала: «Таварыш Петрусевіч, таварыш Петрусевіч, вас сустракае ваенны з кветкамі». Урачыста грае аркестр. «Добры дзень, Казімір Казіміравіч!» – і невядомы падпалкоўнік уручае яму кветкі. Госць з Варшавы быў ашаломлены, бо не ведаў гэтага ваеннага. «Я Уладзімір Пятровіч Румянцаў, сын Пятра Румянцава. Гэта ў нашым доміку праходзіў з'езд РСДРП, а ваш тата быў дэлегатам». Яны абняліся і, як даўнія сябры, весела рушылі да Домамузея. Аб іх сустрэчы пісалі газеты, паведамлялі тэлеканалы.

Петрусевіч-малодшы шмат вандраваў, чытаў лекцыі ва ўніверсітэтах ЗША, Панамы, Мексікі, зрабіў даклад у Маскве на Міжнародным кангрэсе біёлагаўпаляўнічых. Ён вельмі ганарыўся бабуляй Аленай, якая была пляменніцай генерала Парыжскай Камуны Яраслава Дамброўскага, дзедам Янам Наркевічам Ёдкам, які доўга жыў з ім у Вільні.

Род Петрусевічаў працягваецца ў Беларусі. У Душаве жыў калгасны рымар Казімір Петрусевіч, цёзка акадэміка і яго стрыечны брат. Ён часта прасіў сваячку, галоўнага эканаміста СВК «Душава» Ванду Іванаўну Шыманоўскую, пісаць лісты сынам і дочкам знакамітага дэлегата. Ад мужа Станіслава (нашчадка Петрусевіча-старэйшага) і Ванды нарадзіліся дачка Таня (капыльскі педыятр) і сын Аляксандр, які працуе ў Мінску інжынерам.

***Іван ІГНАТЧЫК,***
*г. Капыль*



*Дом, у якім праходзіў I з'езд РСДРП (фота пач. 1960-х гг.)*

## Ліпень

**10 – Марціноўскі Антоній** (Антон; 1781, г.п. Радашковічы – 1855), рэдактар-выдавец (у т.л. першага ў Беларусі і Літве навукова-літаратурнага часопіса «Дзённік Віленскі»), публіцыст, заснавальнік Віленскай друкарні (1817), адзін з арганізатараў і актыўных сябраў таварыства шубраўцаў, Віленскага друкарскага таварыства – 230 гадоў з дня нараджэння.

**10 – Валошын Павел Пятровіч** (1891, Гродзенская губ. – 1937), дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, публіцыст, які пэўны час працаваў у Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У.І. Леніна – 120 гадоў з дня нараджэння.

**11 – Чабор Янка** (сапр. Патаповіч Іван Сцяпанавіч; 1911, Ляхавіцкі р-н – 1943), паэт, публіцыст, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі – 100 гадоў з дня нараджэння.

**14 – Бузук Пётр Апанасавіч** (1891–1938 або 1943), мовазнаўца-славіст, аўтар звыш 70 навуковых прац, у т.л. першага дыялекталагічнага атласа беларускай мовы «Спроба лінгвістычнай геаграфіі Беларусі» (1928), літаратуразнаўца – 120 гадоў з дня нараджэння.

**15 – Цётка** (сапр. Пашкевіч Алаіза Сцяпанаўна; 1876, Шчучынскі р-н – 1916), беларуская паэтэса-рэвалюцыянерка, аўтар першых кніг для дзяцей на роднай мове – 135 гадоў з дня нараджэння.

**20 – Пікарда Гай дэ** (1931–2007), англа-французскі даследчык беларускай культуры, які вывучаў жыццё і дзейнасць Ф. Скарыны, гісторыю перакладаў Біблії на беларускую мову, праблематыку гісторыі ВКЛ і інш., кавалер ордэна Францыска Скарыны – 80 гадоў з дня нараджэння.

**20 – Пяткевіч Часлаў Генрыхавіч** (1856, Хойніцкі р-н – 1936), беларускі і польскі этнограф, фалькларыст, даследчык матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларускага Палесся – 155 гадоў з дня нараджэння.

**21 – Чурко Юлія Міхайлаўна** (1936), мастацтвазнаўца, аўтар манаграфіяў, прысвечаных беларускаму харэаграфічнаму фальклору, класічнаму балету, мадэрну, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998), тэатральнай прэміі імя Кандрата Крапівы (1996) – 75 гадоў з дня нараджэння.

# Той народ жыве, які гісторыю шануе

Плённа дзейнічае гісторыка-краязнаўчы музей у агульнаадукацыйнай школе вёскі Краснае Гомельскага раёна. Яго галоўная задача – захаваць гісторыю роднай вёскі і школы, расказаць пра былых вучняў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, працаўнікоў сельскай гаспадаркі... Тут можна пабачыць старажытныя прылады сялянскага побыту, цікавыя фотаздымкі і дакументы, ваенныя ўзнагароды некаторых жыхароў вёскі Краснае ды шмат чаго іншага.



Як адзначыла ў нашай размове дырэктар вясковай школы Раіса Раманаўна Краўцова, якая, дарэчы, тут пачынала сваю настаўніцкую сцежку яшчэ ў 1976 годзе, музею хутка споўніцца 30 гадоў. За гэты час шмат было назбірана рэдкіх музейных каштоўнасцяў, якія прыцягваюць увагу наведнікаў. Пры жаданні кожны госць можа пакінуць адпаведны запіс у кнізе водгукаў, выказаць свае думкі альбо заўвагі.

Наведваюцца сюды і вучні, якіх у школе сёння 354 чалавекі. Плануецца, што ў новым навучальным годзе будуць створаныя два класы першакласнікаў. Дзяцей таксама прывядуць сюды на экскурсію ды раскажуць шмат чаго цікавага. Бо новаму пакаленню неабходна добра ведаць гісторыю сваёй вёскі і Айчыны, шанаваць родныя карані і продкаў. Недарэмна ж кажуць: той народ жыве, які сваю гісторыю мае і шануе спадчыну, як любую матулю!

***Ганна АТРОШЧАНКА***

***На фота аўтара: дырэктарка Красненскай АСШ (злева) Р.Р. Краўцова знаёміць гомельскую пісьменніцу Раісу Дзейкун з музеем***



*Шумела салодкае івянецкае свята*

*Фота парталу tut.by*

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

***(Пачатак у № 1 за 2003 год)***

**ЛІТО́ЎСКАЯ МОВА** – мова літоўцаў, асноўнага насельніцтва Літоўскай Рэспублікі. Належыць да балтыйскай групы індаеўрапейскіх моваў. З бліжэйшых родзічаў – латышская і пруская мовы (апошняя вядома толькі паводле пісьмовых помнікаў). Першыя рукапісы адносяцца да XIII–XIV стст. Першыя друкаваныя кнігі – «Катэхізіс» М. Мажвідаса (Кёнігсберг, 1547), на тэрыторыі Літвы – «Катэхізіс» М. Даўкшы (Вільня, 1595). Першы слоўнік літоўскай мовы выдаў К. Шырвідас (Вільня, 1629), першую граматыку – Д. Клейпас (Кёнігсберг, 1653). Літаратурная мова склалася ў канцы XIX – пач. XX ст. Пісьмо на аснове лацінскага алфавіта (33 літары).



GRAMMATICA
Litvanica
Mandato & Autoritate
SERENISSIMI ELECTORIS
BRANDENBURGICI
adornata,
& prævia Censurâ
primùm
in lucem edita
à
M. DANIELE Klein/
Pastore Tilſ. Litv.
Præmiſſa eſt ad Lectorem Præfatio
non minùs utilis, quàm neceſſaria.
Cic. de Clar. Orat.
Nihil ſimul eſt & inventum & perfectum.
REGIOMONTI,
Typis & ſumptibus JOHANNIS REUSNERI,
ANNO χειρογονίας clↃ. IↃc. LIII.

*Першая граматыка літоўскай мовы*

Вылучаюць 2 групы гаворак: верхнелітоўскія (аўкштайцкія) і ніжнелітоўскія (жэмайцкія). Аснова літаратурнай мовы – сярэднеаўкштайцкі дыялект. У фанетыцы характэрнае адрозненне доўгіх і кароткіх галосных, толькі кароткія зычныя, 6 дыфтонгаў, рухомы танічны націск; у граматычным ладзе – 2 роды назоўнікаў (мужчынскі і жаночы), 5 скланенняў, 7 склонаў (у т.л. месны беспрыназоўнікавы і клічны), прыметнікі 3 родаў, 4 часы дзеясловаў, у т.л. мінулы аднакратны і мінулы мнагакратны, складаная сістэма дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў; у сінтаксісе – ужыванне недапасаванага азначэння (родны склон прыналежнасці замест прыналежных прыметнікаў) перад назоўнікам, дапаўненне пры непераходных дзеясловах. Літоўская мова ўзаемадзейнічае з беларускай. У літаратурнай мове і гаворках ёсць беларусізмы [abrakas (аброк), rekva (рэхва), guzas (гуж)], адпаведна ў беларускай мове, асабліва ў паўночна-заходніх гаворках, – літуанізмы, пераважна лексічныя («дзірван», «парсюк», «пуня»), а таксама сінтаксічныя – дзеепрыслоўе ў ролі простага выказніка («каровы пад'еўшы») і інш. Шмат літуанізмаў засталося ў побытавай лексіцы: атоса, венцер, дойлід, ёўня, клуня, коўш, свіран, сціртa, торп, шуло і інш. Некаторыя маюць вузкае тэрытарыяльнае пашырэнне: аруд, бонда, груца, прывен, ройста, рэзгіны. Паводле свайго паходжання літоўскія некаторыя тапанімічныя назвы (Ашмяны, Гудагай, Юрацішкі, Канвелішкі, Жупраны), прозвішчы (Лукша, Мархель, Юргель, Вайцюль, Марцуль).




*Граматыка, выдадзеная па-беларуску (Мінск, «Радыёла-плюс», 2010)*

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае унітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віталь Скалабан, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26, 334 61 62. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры передруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 30.06.2011.
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.
Заказ 649.
Тыраж 1080 асобнікаў.